**К. Рулеўская**

# ТЫПАЛОГІЯ ПРЫСЛОЎНЫХ КАМПАЗІТНЫХ НЕАЛАГІЗМАЎ У ПАЭТЫЧНЫМ ЗБОРНІКУ Р. БАРАДУЛІНА “КСТЫ”

Паэзія Рыгора Барадуліна – невычэрпная крыніца мудрасці, ведаў і ўнікальнасці для беларускай літаратуры. Гэты шырокі пласт дае моцныя падставы лінгвістам шукаць самыя цікавыя рэчы для развіцця і пашырэння мовы.

Мэтай навуковага даследавання з’яўляецца пашырэнне і распаўсюджванне ўжывання сапраўды новых для беларускай мовы слоў, іх замацоўванне, вызначэнне ролі кампазітных слоў. Для рэалізацыі мэты былі пастаўлены наступныя задачы: выбраць з паэтычнага зборніка “Ксты” кампазітныя неалагізмы-прыслоўі, тыпізаваць іх, вызначыць лінгвапрагматычныя функцыі і прааналізаваць іх ролю ў развіцці сучаснай беларускай мовы.

У ходзе даследавання кампазітныя словы Р. Барадуліна разглядаліся на розных моўных узроўнях. У аснову “новых” слоў трапляюць два віды сінтаксічных адзінак (словазлучэнне), звязаных сувяззю дапасавання і кіравання. З гэтага вынікае тое, што ў большасці выпадкаў залежным кампанентам у іх з’яўляецца якасны ці адносны прыметнік. Разгледзім на прыкладах кампазітных прыслоўяў *белааблока* і *чорнахмара.* Р. Барадулін утварае словы па прадуктыўнай мадэлі “Adj → Adv” з дапамогай суфіксальнага спосабу, аднак ад такіх прыметнікаў, якія ў мове не функцыянуюць. Спосаб можна кваліфікаваць як складанасуфіксальны.

Пераходзячы да лінгвапрагматычных функцый кампазітаў, заўважаецца выкарыстанне Барадулінам кампрэсіўных стратэгій словаўжывання. Аўтар пазбаўляецца збыткоўнасці і нагрувашчвання ў моўных канструкцыях, якія ўскладняюць успрыманне аўтарскай думкі і перашкаджаюць данясенню пасылу да чытача. Р. Барадулін спрабуе за кошт выкарыстання кампрэсіўных моўных адзінак як можна дакладней выразіць сваю думку. Таму ён аддае перавагу менавіта кампазітам, а не словазлучэнням.

Такім чынам, стварэнне аказіяналізмаў як спосаб рэалізацыі патэнцыйных функцый мовы забяспечвае не толькі творчы ўздым у вывучэнні паэзіі, але і цалкам садзейнічае раскрыццю новых магчымасцей белаускай мовы. У ходзе даследавання прыходзім да высноў, што розныя функцыі мовы ў паэтычных тэкстах могуць сумяшчацца, пераплятацца; спараджаюцца варыянты, разнавіднасці данясення аўтарскай думкі праз стварэнне неалагізмаў, якія паддаюцца тыпізацыі.